Але, як мы бачым з незакончанай аповесці Гофмана "Запіскі ката Мура", намаганні Крэйслера разбіваюцца пры сутыкненні са светам бездухоўнасці і жорсткасці нямецкіх філісцераў, у якіх на першым плане стаяць грашовыя інтарэсы і голы практыцызм. Таленавіты музыкант і кампазітар гіне ў няроўнай барацьбе, так і не сцвердзіўшы ў жыцці свае высокія ідэалы. Пры выкладанні тэмы "Творчасць Гофмана" трэба звярнуць увагу студэнтаў на тое, што Гофман памыляўся, калі супрацьпастаўляў мастацтва і жыццё, аддаючы перавагу мастаку і мастацтву, завышаючы іх ролю ў вырашэнні сацыяльных праблем. Пераканаўся ў памылковасці свіх поглядаў пісьменнік толькі ў канцы свайго жыцця, сведчаннем чаго і з'яўляецца яго апошні твор "Запіскі ката Мура".

Пры вывучэнні дэкадансу неабходна пазнаёміць студэнтаў з творчасцю такога таленавітага пісьменніка, як О.Уайльд. Вывучэнне яго тэарэтычных поглядаў і іх выкарыстанне ў мастацкіх творах дапаможа студэнтам зрабіць правільныя вывады аб суадносінах паміж жыццём і мастацтвам.

Творчасць О.Уайльда з'яўляецца пераканаўчым доказам згубнага ўплыву дэкадансу на сапраўднае мастацкае дараванне. Пісьменнік вельмі востра адчуваў крывадушнасць і фальш буржуазнага мастацтва, усё сваё жыццё змагаўся з афіцыйнымі грамадскімі меркаваннямі, аднак памыляўся, калі адзін выхад з супярэчнасцей тагачаснага жыцця бачыў у супрацьпастаўленні рэчаіснасці свету мастацкай фантазіі, мары аб прыгожым і светлым жыцці."Мастак той, хто ставарае прыгажосць", - пісаў Уайльд. Сваю ідэалістычную філасофію мастацтва пісьменнік прадэманстраваў у шэрагу артыкулаў і трактатаў. Згодна Уайльду, мастацтва вышэй за жыццё. Пісьменнік нават дагаворваецца да таго, што сапраўдны мастак вышэй законаў маралі, ён можа стаць нават злачынцам. Мастак пісаў: "Кніга не можа быць маральнай або немаральнай, яна можа быць добра напісана або дрэнна".

Такім чынам, О.Уайльд у сваёй тэорыі раз'[illegible]ноўвае праблемы маралі і мастацтва, этыкі і эстэтыкі, але ж у большасці мастацкіх твораў ён займаецца маралізатарствам. У такіх яго творах, як "Партрэт Дарыяна Грэя", "Зорны хлопчык", "Кантэрвільскі прывід" і інш., ён паказвае, што зло, у якім прыгожым абліччы яно б ні выступала, заўсёды перамагаецца дабром. Гэта пераконвае ў тым, што ў творчасці Уайльда талент мастака перамагае эстэтства тэарэтыка.

Пры вывучэнні творчасці славянскіх паэтаў і пісьменнікаў XIX - пач.XX ст. Пушкіна, Лермантава, Някрасава, Міцкевіча, Багдановіча трэба падкрэсліць, што на іх погляды аказаў вялікі ўплыў рэвалюцыйны рамантык Англіі Д.Байран. Ён лічыў, што прамы абавязак паэта - заклік да барацьбы за сацыяльную справядлівасць ("Песня да лудзітаў", "Праметэй" і інш.). Падобна Байрану, Пушкін ніколі не аддзяляў мастацтва і мастака ад рэчаіснасці, яго паэтычныя пазіцыі носяць дзейсны характар. Гэта яскрава відаць у такіх яго вершах, як "Да Чаадаева", "У Сібір", "Помнік", "Прарок" і інш.

Някрасаў быў далёкі ад рамантызму, ён быў рэалістам. У яго творах мы амаль не бачым прамых заклікаў да барацьбы, аднак колькі спачування і болю да абрабаваных жыццём людзей мы адчуваем у многіх яго творах! Гэта і "Чыгунка", "Каля параднага пад'езда", "На Волзе", "Каму на Русі жыць добра", "Я ліру прысвяціў народу свайму".

Такім чынам, разгляд творчасці вышэйназваных пісьменнікаў і паэтаў і іх твораў дапаможа студэнтам, будучым прапагандыстам культуры, правільна арыентавацца ў пытаннях суадносін паміж мастацтвам і рэчаіснасцю і прызначэння ролі мастака і яго творчасці ў жыцці грамадства.

Мархоцкі Я.Л.,
канд.мед.навук,
прафесар

## РОЛЯ СУЧАСНЫХ МЕДЫЦЫНСКІХ, САНІТАРНА-ГІГІЕНІЧНЫХ ВЕДАЎ І НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЫ Ў ПАВЫШЭННІ ПРАФЕСІЙНАГА ЎЗРОЎНЮ ВЫКЛАДЧЫКАЎ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА

Згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 9 сакавіка 1993 года, N 140, у гуманітарных ВНУ праводзіцца навучанне студэнтаў па курсу "Асновы медыцынскіх ведаў" (160 гадзін). Праграма гэтага курса прадугледжвае падрыхтоўку студэнтаў па асновах медыцынскіх, санітарна-гігіенічных ведаў і на-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

роднай медыцыне. Студэнты вучацца аказваць медыцынскую дапамогу ў надзвычайных умовах, даглядаць за хворымі і пацярпеўшымі, па дазіметрычнаму і радыёметрычнаму кантролю. Гэта прамым ці ўскосным шляхам уплывае на фарміраванне асобы будучых работнікаў культуры і мастацтва, іх нацыянальную культуру і свядомасць.

У апошнія гады ў Рэспубліцы Беларусь значна павялічылася ўздзеянне сацыяльных і экалагічных фактараў на чалавека. Многія людзі, у тым ліку і выкладчыкі сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, вядуць не здаровы спосаб жыцця: 60-70% людзей пазбягаюць фізічнай культуры і спорту; 50-60% мужчын і 15-20% жанчын кураць тытунь; 70-90% дарослага насельніцтва ўжываюць алкагольныя напіткі; многія парушаюць асновы рацыянальнага харчавання.

Маладзеюць венерычныя хваробы. Сярод захварэўшых сіфілісам ва ўзросце ад 15 да 17 гадоў у 1992 годзе было 89 падлеткаў. Хварэўшых ганарэяй ва ўзросце ад 15 да 17 гадоў - 402 юнакі і 629 дзяўчат. Усяго за 1992 год хварэўшых ганарэяй па рэспубліцы было 13418 чалавек.

Вынікі нездаровага спосабу жыцця вядуць да атэрасклерозу (у 50% дарослага насельніцтва утрыманне халестэрыну ў крыві звыш нормы); ішэмічнай хваробы сэрца (фініш гэтай хваробы, як правіла, - інфаркт міякарда); гіпертанічнай хваробы (15-20% дарослых маюць павышаны ціск артэрыяльнай крыві). Нерацыянальнае харчаванне часта вядзе да атлусцення, цукровага дыябету, а гэта значыць, скарачэння жыцця і інваліднасці. Безумоўна, тут дарэчы словы А.М.Талстога, што смешна патрабаванне людзей, якія кураць, п'юць, аб'ядаюцца, не працуюць, ператвараюць ноч у дзень аб тым, каб доктар зрабіў іх здаровымі.

У працэсе вывучэння матэрыялу названага курса студэнты вучацца прыёмам рацыянальнага харчавання, узорным паводзінам у агульных месцах, барацьбе са шкоднымі звычкамі, асабістай і агульнай гігіене. Курс "Асновы медыцынскіх ведаў" знаёміць навучэнцаў з патрабаваннямі да культуры працы і адпачынку, культуры слова і чалавечых адносін. З вялікай цікавасцю засвойваецца студэнтамі матэрыял аб уласцівасцях фауны і флоры Рэспублікі Беларусь, таямніцах народнай медыцыны.

Андрэеўская В.Л.,
канд.біял.навук,
ст.выкладчык

## РОЛЯ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ МУЗЫКІ Ў НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ І ПАВЫШЭННІ ПРАФЕСІЙНАГА ЎЗРОЎНЮ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

Адным з магутных спосабаў стымуляцыі станоўчых эмоцый, якія служаць не толькі "акумулятарамі здароўя", але і эфектыўным сродкам павышэння працаздольнасці, з'яўляюцца зносіны з мастацтвам, асабліва з найбольш дзейсным яго відам - музыкай.

Дзякуючы даступнасці ў век НТР музыка ўжо дастаткова зарэкамендавала сябе ў медыцыне, спорце, на вытворчасці. Пэўны станоўчы вопыт яе выкарыстання існуе і ў сферы разумовай працы. Ёсць і нешматлікія, але вельмі цікавыя звесткі аб выкарыстанні музыкі работнікамі адукацыі для аблягчэння і павышэння эфектыўнасці вучэбнай дзейнасці - адной з найбольш энергаёмістых галін разумовай працы па ступені напружання ўвагі, памяці, мыслення. Пры гэтым арганізму часта прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні. І пасля перыядаў уцягвання ў працу і высокай яе прадукцыйнасці заканамерна настае перыяд зніжэння працаздольнасці. Усім вядомыя спосабы прафілактыкі стомленасці (прытрымліванне рэжыму дня, рэгулярнае праветрыванне памяшкання, фізічныя практыкаванні і інш.) парушаюць нармальны ход вучэбнага працэсу. Гэтага недахопу пазбаўлена функцыянальная музыка, і многія эксперыменты айчынных даследчыкаў сведчаць аб станоўчых выніках яе выкарыстання ў час лекцый, практычных заняткаў і экзаменацыйнай сэсіі. Даследаванні і анкетнае апытанне студэнтаў і выкладчыкаў паказваюць,што ў першых адбываліся значныя змены галоўных паказчыкаў дзейнасці СС, ЦНС і паляпшаліся адносіны да вучобы; другія адзначалі жаданне працаваць з натхненнем і ўздымам.

Такім чынам, пранікненне функцыянальнай музыкі ў вучэбны працэс вядзе да павышэння эфектыўнасці працы студэнтаў і выкладчыкаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ